**УДК 811.161.3**

# «ВУЧЭБНЫ» ТЭКСТ ШКОЛЬНАГА ПАДРУЧНІКА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ЯК ЛІНГВАМЕТАДЫЧНАЯ АСНОВА ФАРМІРАВАННЯ ПРАДМЕТНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ

***канд. філал. навук, дац. Л.С. ВАСЮКОВІЧ***
***(Віцебскі філіял Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО»)***

*Вызначана спецыфіка вучэбнага тэксту, дэтэрмінаваная характарам пазнавальнай дзейнасці, ва ўмовах якой адзінка выступае аб'ектам, інструментам, асновай, прадуктам навучання. Аналізуюцца тыпалагічныя тэкставыя катэгорыі: інфарматыўнасць, камунікатыўнасць, дыялагічнасць, адрасаванасць, аксіялагічнасць, універсальнасць. Аўтар прыходзіць да высновы, што вучэбны тэкст як аснова фарміравання прадметных кампетэнцый характарызуецца шматаспектнасцю лінгваметадычнага статусу: лінгва-сэнсавы эталон тэкставай дзейнасці, зместавая апора для выказванняў, сродак захавання культурнай інфармацыі, спосаб назапашвання інтэлектуальна-маўленчага вопыту.*

***Ключавыя словы:*** *вучэбны тэкст школьнага падручніка, прадметныя кампетэнцыі, тэкставыя катэгорыі, лінгваметадычны статус вучэбнага тэксту.*

**Уводзіны.** Праблема выкарыстання тэксту падручніка ў якасці асновы фарміравання прадметных кампетэнцый не можа быць асэнсавана без аналізу вучэбнага тэксту (ВТ) як тыпалагічнай адзінкі, без вызначэння яго камунікатыўна-прагматычных і структурна-зместавых асаблівасцей. Задача артыкула: акрэсліць лінгваметадычны статус вучэбнага тэксту ва ўмовах фарміравання прадметных кампетэнцый навучэнцаў.

Нагадаем: прадметныя кампетэнцыі – гэта сукупнасць ведаў, уменняў, спосабаў дзейнасці, а таксама сістэмна-каштоўнасных матываў і рэфлексійных уменняў, сфарміраваных у выніку засваення навучэнцамі прадметнай галіны. Прадметныя кампетэнцыі сведчаць аб сфарміраванасці цэласнага ўяўлення пра беларускую мову як сістэму, яе функцыі, структуру, пра засваенне ўменняў аналізу і ацэнкі моўных фактаў і з'яў у тэкстах розных стыляў з лінгвістычных і эстэтычных пазіцый.

**Асноўная частка.** На сучасным этапе развіцця моўнай адукацыі ва ўмовах паглыблення і дыферэнцыяцыі як самога паняцця *тэкст*, так і форм узаемадзеяння асобы з тэкстам відавочная абмежаванасць адасобленых аспектаў вывучэння адзінкі. Вучэбны тэкст асэнсоўваецца не толькі як носьбіт інфармацыі, але і як аснова фарміравання кампетэнцый, сродак развіцця інтэлектуальна-маўленчых уменняў асобы. Дыдактызацыя тэкстаў скіравана на стварэнне ўмоў для развіцця пазнавальных уменняў і эмацыянальна-каштоўнасных адносін асобы да інфармацыі.

Сучаснае асэнсаванне вучэбнага тэксту павінна ўлічваць яго статус як кампанента тэкставай дзейнасці. Адзінка *тэкставая дзейнасць* прыйшла ў метадычны паняційны тэзаўрус з семіясацыяпсіхалогіі, якая абгрунтоўвае ролю і месца тэксту ў фарміраванні грамадскіх сувязей і адносін. На думку Т.М. Дрыдзе, тэкставая дзейнасць уяўляе сабой "асобасную актыўнасць, якая падразумявае вербальныя і невербальныя інтэлектуальна-разумовыя аперацыі для арганізацыі зносін" [1, с. 46].

Тэкставая дзейнасць разгортвае "найвышэйшы ўзровень" інтэлектуальна-разумовай актыўнасці індывіда, што знаходзіць выражэнне ў "сістэме дзеянняў на аснове ведаў, уменняў, якія дазваляюць ствараць тэксты і інтэрпрэтаваць іх" [2, с. 233]. Значымым для нашага даследавання з'яўляецца інтэрпрэтацыя тэксту ў межах дзейнасці, ва ўмовах якой тэкст разглядаецца не як "моўная адзінка, а як адзінка зносін, як функцыянальная змястава-сэнсавая цэласнасць, суадносная з камунікатыўна-пазнавальным намерам суб'екта зносін" [1, с. 71].

Ва ўмовах кампетэнтнаснага падыходу да адукацыі актуалізуецца праца па фарміраванні тэкставай дзейнасці навучэнцаў. Метадычная каштоўнасць падобнай дзейнасці набывае вагу ў сувязі са значнасцю тэкстава-інфармацыйных уменняў асобы, яе гатоўнасці да паўнацэнных зносін у вуснай і пісьмовай формах. Якасць сфарміраваных уменняў працаваць з тэкставай інфармацыяй (шукаць, аналізаваць, трансфармаваць, ствараць і ацэньваць) з'яўляецца паказчыкам інтэлектуальнага і агульнакультурнага ўзроўняў моўнай асобы.

Дыялектычнае развіццё тэорыі тэксту, у рэчышчы якой эвалюцыянавала само азначэнне тэксту, аб'ектыўная ацэнка зробленага іншымі навукоўцамі патрабуюць актуалізацыі паняцця ў кантэксце фарміравання прадметных кампетэнцый навучэнцаў. Дэфініраванне адзінкі *вучэбны тэкст* дазволіць канкрэтызаваць яго лінгваметадычны статус. Напачатку падкрэслім, што прычынай адсутнасці агульнапрынятага вызначэння вучэбнага тэксту (як і тэксту наогул) з'яўляецца складанасць феномена адзінкі, шматаспектнасць якой вымушае абавязковых карэкцый або змен у залежнасці ад таго, які аспект вывучэння з'яўляецца дамінуючым. Невыпадкова Е.С. Кубракова падкрэслівае, што цяжкасці пошукаў паняцця тэксту звязаны з тым, што "звесці ўсё мноства тэкстаў у адзіную сістэму гэтак жа складана, як выявіць за гэтым мноствам набор дастатковых і неабходных уласцівасцей адзінкі" [3, с. 76].

З мэтай вызначэння паняцця *вучэбны тэкст* прааналізуем тэкставыя катэгорыі як "прыметы, уласцівыя ўсім тэкстам, без якіх не можа існаваць ні адзін тэкст – *тыпалагічныя ўласцівасці*" [4, с. 13], што выяўляюць інтэграваную сутнасць адзінкі. Адпаведна паняцце вучэбнага тэксту канкрэтызуем у рэчышчы катэгорый, якія павінны быць улічаны пры фармулёўцы дэфініцыі:

– *інфарматыўнасць* як адна з галоўных прымет любога тэксту, якая ўтрымлівае сукупнасць звестак пра аб'екты апісання. Сярод прымет інфарматыўнасці тэксту даследчыкі (І.Р. Гальперын, Т.В. Матвеева, В.І. Шляхаў і інш.) вылучаюць наяўнасць агульнапрызнаных канцэпцый, вядучых палажэнняў, тэрмінаў як метамовы навукі, абстрагаванасць інфармацыі. Паводле І.Я. Гальперына, тэкст выступае пастаяннай крыніцай новага і таму заўсёды інфарматыўны [5, с. 134]. Аднак разуменне ВТ з выключна інфармацыйных пазіцый не адпавядае сучасным уяўленням пра тэкст, тэкставую дзейнасць, камунікатыўную ў сваёй аснове;

– *камунікатыўнасць* як тыпалагічная ўласцівасць прызнае за тэкстам статус удзельніка вучэбнай камунікацыі. Пры гэтым сам тэкст можа выступаць "у якасці ініцыятара зносін" [6, с. 60]. Тэкст выяўляе сваю камунікатыўную сутнасць толькі праз дыялог з чытачом. Менавіта камунікатыўнасць, на думку даследчыкаў, з'яўляецца першаснай "прыметай тэкстуальнасці. Тэкст – гэта кагерэнтная паслядоўнасць моўных (у шэрагу выпадку і нямоўных) знакаў, прызначэнне якіх – выяўляць пэўную камунікатыўную мэту" [7, с. 47].

Камунікатыўны характар працы з ВТ заключаецца ў тым, каб захаваць на ўроку рэальную сітуацыю зносін чытача з тэкстам, стварыць умовы для дыялогу з аўтарам. Умовай паспяховай камунікацыі з'яўляецца актыўная кагнітыўная дзейнасць навучэнца па разуменні і засваенні зместу тэксту. Праца з ВТ пры гэтым разглядаецца як форма ўзаемадзеяння чытача і тэксту. Паколькі камунікатыўная сутнасць адзінкі выяўляецца толькі ў дыялогавым рэжыме з чытачом, "тэкст мёртвы без акта пазнання" [8, с. 107].

Лагічная аперацыя дэфініравання патрабуе ўліку такога ключавога параметра вучэбнага тэксту,як *дыялагічнасць,* паколькі першасна тэкст запланаваны, спраецыраваны на зносіны, на ўзаемаразуменне. Паводле пазіцыі М.М. Бахціна, дыялагічнасць тэкставай прыроды выяўляецца ў тым, што любы тэкст з'яўляецца рэакцыяй у адказ, усякае разуменне тэксту ёсць суаднесенасць яго з іншымі выказваннямі" [9, с. 91]. Вучэбны тэкст, як і любы іншы, прадугледжвае наяўнасць камунікантаў – складальніка падручніка (адрасанта) і чытача-навучэнца (адрасата). Дыялагічнасць вучэбнага тэксту праецыруе ўзаемадзеянне камунікантаў, дыдактычную неабходнасць улічваць адрасантам магчымыя рэакцыі адрасата (напрыклад, разуменне/неразуменне зместу адзінкі).

Дыялагічныя адносіны ў вучэбным тэксце ўзнікаюць не адвольна, а паводле задумы аўтара, які выкарыстоўвае для гэтага набор спецыяльных сродкаў і прыёмаў іх арганізацыі. Менавіта дыдактычная скіраванасць адзінкі, наяўнасць кампанентаў, што рэгулююць і стымулююць пазнавальную дзейнасць, улік фактараў адрасата могуць разглядацца як праяўленне дыялагічнасці вучэбнага тэксту. Формамі дыялагізацыі выступаюць: зварот да чытачоў, да аўтарытэтных вучоных праз цытаванне, упамінанне прозвішчаў, назваў прац, наяўнасць пытанняў, вобразнае ўспрыманне інфармацыі праз выкарыстанне метафар, параўнанняў, прыкладаў-ілюстрацый, імператыўных форм як спосабаў пераканання, удзелу ў сумесных разважаннях, пошуках ісціны.

*Адрасаванасць* вучэбнага тэксту выяўляе яго прызначанасць для пэўнага кантынгента навучэнцаў. Адрасаванасць адзінкі мае маўленчае выражэнне. Як паказвае аналіз сучасных падручнікаў, існуюць паказчыкі знешняй і ўнутранай адрасаванасці. Да паказчыкаў *знешняй адрасаванасці* адносяцца:

а) ужыванне займеннікаў, найперш займенніка *мы*, які дэманструе ўзаемадзеянне складальніка падручніка і навучэнца-чытача;

б) выкарыстанне пабуджальных і пытальна-рытарычных сказаў з мэтай стварэння "атмасферы" дыялагічнасці ў маналагічным тэксце;

в) дэманстрацыя розных меркаванняў, пры якіх чытачу прапануецца выбраць найбольш верагодную, абгрунтаваную пазіцыю;

г) прыклады-ілюстрацыі, якія выступаюць своеасаблівым зваротам да чытача, яго вопыту пазнання.

Паказчыкамі *ўнутранай адрасаванасці* з'яўляюцца:

а) цытаванне як найбольш адэкватная інтэрпрэтацыя чужога меркавання, магчымасць прадставіць, разгарнуць розныя навуковыя пазіцыі;

б) спасылкі на іншыя крыніцы і аўтараў, каментарыі, заўвагі да асноўнага тэксту;

в) запрашэнне да сумеснага разгляду праблемы.

*Аксіялагічнасць* вучэбнага тэксту вылучае адзінку як каштоўнасць асобаснай і сацыяльнай значнасці ў сістэме нацыянальнай і агульначалавечай культуры. У аксіялагічным кантэксце дэкларуецца сувязь паміж узроўнем культуры асобы і засвоенымі ёю тэкстамі, сцвярджаецца, што "ўзровень агульнага і маўленчага развіцця асобы вызначаецца аб'ёмам і якасцю засвоеных тэкстаў з назапашаных грамадствам духоўных набыткаў" [10, с. 6–7]. Для спасціжэння культурнай вартасці тэкстаў навучэнец павінен уключыць іх ва ўласны тэзаўрус лінгвістычных і духоўна-маральных нормаў.

*Універсальнасць ВТ* заключаецца ў тым, што асобны вучэбны тэкст у школьным падручніку выступае як прататыпічны прадстаўнік мноства тэкстаў, якія адлюстроўваюць аднародныя фрагменты пэўнай прадметнай сферы, абслугоўваюць аднатыпныя пазнавальна-камунікатыўныя сітуацыі. Такія тэксты маюць аднолькавы набор камунікатыўна-сэнсавых блокаў, уніфікаваны набор маўленчых формул.

Вызначаны аб'ём аптымальнага набору катэгарыяльных прымет вучэбнага тэксту (інфарматыўнасць, камунікатыўнасць, дыялагічнасць, аксіялагічнасць, універсальнасць) стварае аснову для рацыянальнага дэфініравання адзінкі. Разам з тым прыведзеныя прыметы маюць нястрогі, няжорсткі характар. Адны з іх могуць быць дамінуючымі, стабільнымі, іншыя – патэнцыяльнымі, варыятыўнымі. Трэба пагадзіцца, што акрэсленыя прыметы "маюць градуальны характар: 1) яны валодаюць рознай ступенню валіднасці ў розных тыпах тэксту;

2) не ўсе прыметы могуць і павінны праяўляцца ў кожным тэкставым экзэмпляры; 3) не ўсе прыметы тэкстуальнасці маюць аднолькавую значнасць для сцвярджэння (або адмаўлення) тэкставага статусу" [7, с. 53].

З улікам акрэсленых тэкставых катэгорый разгледзім азначэнні вучэбнага тэксту, прапанаваныя ў сучасных даследаваннях. Праведзены аналіз дэфініцый сведчыць пра няўстойлівасць зместу тэрмінаў і выяўляе наступныя тэндэнцыі, што ўскладняюць працэдуру дэфініравання адзінкі:

1) у шматлікіх працах адзінка *вучэбны тэкст* разглядаецца ў якасці пэўнай эмпірычнай дадзенасці, без вызначэння паняцця: вучэбна-навуковы тэкст разумеецца як "тэкст падручніка па пэўнай дысцыпліне" [11, с. 3];

2) вылучэнне асобнай канкрэтнай катэгорыі, уласцівай вучэбнаму тэксту: мадальнасці (В.М. Шашкова); даступнасці, чытабельнасці (Ю.Ф. Шпакоўскі); дыскурсійных характарыстык адзінкі (Н.Н. Ганчар);

3) фармальнасць азначэнняў паняцця як вынік неразмежавання тэксту/вучэбнага тэксту, напрыклад: "Вучэбна-навуковыя тэксты складаюць аснову вучэбных дапаможнікаў, якія закліканы навучаць" [12, с. 9]; "даступны вучэбны тэкст – гэта тэкст, які з'яўляецца… аптымальна цяжкім" [13, с. 3];

4) частка азначэнняў характарызуецца шырокім, адвольным наборам параметраў або дыфузнасцю характарыстык адзінкі, абумоўленых тэарэтычнай нераспрацаванасцю праблемы: "Вучэбны тэкст уяўляе сабой навукова-вучэбны твор у жанры вытлумачальнага маналогу" [14, с. 13];

5) мнагазначнасць, размытасць прапанаваных азначэнняў-назіранняў, якія не ўтрымліваюць прымет, што раскрываюць сутнасць паняцця: "Уважлівы разгляд вялікай колькасці вучэбных тэкстаў паказвае, што з мэтай пагружэння рэцыпіента ў розныя сферы зносін, у сучаснай тэкставай прасторы ўжываюцца розныя функцыянальна-стылістычныя тыпы тэкстаў, якія вылучаюцца разнастайнасцю жанраў (газетныя і часопісныя артыкулы, апавяданні, вершы, песні, анкеты, аб'явы і інш.)" [15, с. 122].

Зазначым, што на сённяшні дзень пры звароце да феномена вучэбнага тэксту даследчыкі карыстаюцца рознымі тэрмінамі: *вучэбны тэкст, вучэбна-навуковы тэкст, навукова-вучэбны тэкст, дыдактычны тэкст, вучэбна-дыдактычны тэкст, навукова-дыдактычны тэкст, вучэбна-моўны тэкст* і інш. Суіснаванне розных адзінак у кантэксце педагагічных даследаванняў дэманструе не толькі няўстойлівую тэрміналагічную практыку, але і пацвярджае складанасць паняцця, якое, нягледзячы на актыўнасць, частотнасць ужывання, не мае адназначнай трактоўкі.

У даследаваннях беларускіх вучоных азначэнне вучэбнага тэксту прапанавана В.А. Ляшчынскай, якая правамерна бачыць у вучэбным тэксце "адзінку навучання тэкставай дзейнасці, тэкставай камунікацыі, цэнтральны кампанент падручніка і кожнага ўрока беларускай мовы" [16, с. 68].

Сінтэзуючы падыходы і аспекты даследаванняў вучэбнага тэксту, зробім спробу дэфініраваць паняцце ў кантэксце дасягненняў педагагічнай навукі. На нашу думку, статус ***вучэбнага*** набывае ***тэкст*** як кампанент тэкставай дзейнасці, уключаны з дыдактычнымі мэтамі ў сферу вучэбнай камунікацыі, у межах якой выступае асновай аналізу, інтэрпрэтацыі і стварэння ўласных выказванняў. Праца з тэкстам разглядаецца як камунікатыўна-пазнавальная дзейнасць, як інтэлектуальная форма ўзаемадзеяння паміж навучэнцам і тэкстам, скіраваная на разуменне і засваенне зместу адзінкі. У аснове разумення тэксту знаходзяцца маўленча-інтэлектуальныя аперацыі. Так, айчынны метадыст В.У. Протчанка бачыць у мове, моўнай адукацыі "механізм фарміравання асобы, сродак развіцця інтэлекту" [17, с. 56]. М.І. Жынкін сцвярджае: працуючы з тэкстам, мы пераходзім "у кампетэнцыю інтэлекту" [18, с. 88], што абумоўлівае "асаблівасці пазнавальных адносін суб'екта да свету і характар узнаўлення рэчаіснасці ў індывідуальнай свядомасці" [19, с. 94].

Сказанае дае падставу разглядаць працу з тэкстам як інтэлектуальна-маўленчую дзейнасць, якая прадугледжвае развіццё пазнавальных матываў, фарміраванне каштоўнасных адносін да ведаў, засваенне рацыянальных спосабаў дзейнасці і прыёмаў аналізу вучэбнага тэксту, трансфармацыі і самастойнага выкарыстання атрыманай інфармацыі, а таксама адэкватнага афармлення ўласных выказванняў. З улікам сфармуляванага азначэння вучэбны тэкст разглядаецца як інтэграваны аб'ект, шматаспектны феномен, які вербалізуе (візуалізуе) інфармацыйна-зместавы, культуразнаўчы фрагмент ведаў, ізаморфны структуры пазнавальнай дзейнасці ўдзельнікаў вучэбнай камунікацыі.

Такім чынам, складанасць і рознааспектнасць азначэнняў адзінкі можна патлумачыць, на нашу думку, поліфункцыянальнай прыродай вучэбгага тэксту, яго функцыянаваннем у пазнавальным працэсе ў якасці аб'екта аналізу, узнаўлення і разумення. Адпаведна тэкст можна трактаваць як мадэль працэсу вучэбных зносін у рамках тэкстава-інфармацыйнай дзейнасці. Гэта значыць, што ВТ можа быць адэкватна апісаны, інтэрпрэтаваны толькі ў структуры той дзейнасці, у якой ствараецца і функцыянуе. З улікам характару пазнавальнай дзейнасці тэкст не з'яўляецца гамагенным паводле паходжання, паколькі яго лінгваметадычны статус разнародны: гэта моўная і дыдактычная адзінка, кампанент і прадукт вучэбнай камунікацыі, адзінка культуры. Лінгваметадычная сутнасць ВТ не можа быць вытлумачана па-за рамкамі пазнавальна-камунікатыўнай дзейнасці. Тэкст у вучэбнай камунікацыі выконвае функцыі, абумоўленыя дыдактычнай сітуацыяй, нятоеснай камунікатыўнай задачы сферы першаснага бытавання адзінкі. Побач з агульнымі параметрамі, уласцівымі любому тэксту, ВТ мае шэраг спецыфічных, звязаных з функцыянаваннем адзінкі ў межах вучэбнай камунікацыі. Спецыфіка адзінкі як кампанента школьнага падручніка па мове дэтэрмінавана характарам пазнавальнай дзейнасці, якая прадвызначае *лінгваметадычнае адзінства вучэбнага тэксту: гэта аб'ект, інструмент, аснова, прадукт навучання.*

Такім чынам, сучасны вучэбны тэкст як лінгваметадычная аснова фарміравання прадметных кампетэнцый трактуецца *як поліфункцыянальнае ўтварэнне*:

– *лінгва-сэнсавы эталон* тэкставай дзейнасці, скіраванай на аналіз, разуменне, інтэрпрэтацыю "чужых" і стварэнне ўласных тэкстаў;

– *зместавая апора* для фарміравання відаў маўленчай дзейнасці, аб'яднаных працэдурамі разумення вучэбнага тэксту: слуханне, чытанне, гаварэнне і пісьмо;

– *камунікатыўная адзінка,* першасна прызначаная быць мэтай, зместам і сродкам зносін, (паводле А.М. Лявонцьева, "навучанне зносінам для зносін у працэсе зносін") [20, с. 114];

– *прадукт маўлення,* які разгортвае механізм маўленчай дзейнасці ад тэксту-эталона да тэксту-прадукту, што адлюстроўвае паслядоўнасць, этапнасць пазнавальных дзеянняў – праз чытанне, аналіз, інтэрпрэтацыю адзінкі да стварэння ўласнага выказвання;

– *дзейнасная аснова* для развіцця прадметных кампетэнцый, што ілюструе ўзаемасувязь фарміравання каштоўнасных арыентацый, прадметных (вучэбна-моўных) і метапрадметных уменняў, універсальных дзеянняў навучэнцаў. Менавіта на аснове тэксту ажыццяўляюцца пазнавальныя працэдуры: тэкст чытаецца, разумеецца, аналізуецца, трансфармуецца, каментуецца, ствараецца;

– *універсальны сродак* захавання культурнай інфармацыі, засваення тэкставай дзейнасці, спосабу назапашвання інтэлектуальна-маўленчага вопыту.

Вучэбны тэкст школьнага падручніка мысліцца як тэкст культуры, інструмент яе трансляцыі, прадукт культуры. Дасягненне вынікаў, арыентаваных на засваенне культуры (усведамленне мовы як нацыянальна-культурнай каштоўнасці, асэнсаванне яе камунікатыўна-эстэтычных магчымасцей, дасягненне агульнакультурнага ўзроўню), немагчыма без апоры на ўзорны тэкст. Неабходнасць навучаць працы з тэкстам, разуменню тэкставай інфармацыі, стратэгіям асэнсаванага чытання вымагае фармулявання прыярытэтнай ролі вучэбнага тэксту ў працэсе дасягнення адукацыйных вынікаў – асобасных, прадметных і метапрадметных.

Сучасная моўная адукацыя патрабуе акцэнтавання працы з тэкстам як універсальнай духоўна-практычнай дзейнасці, што забяспечвае рух ад уласна прадметных ведаў да спасціжэння, пазнання свету культуры з дапамогай тэксту. Тэкст як цэнтральнае звяно школьнага падручніка ўяўляе сабой вучэбны прадукт, прызначаны для асэнсавання і спазнання. Фарміраванне ўменняў працаваць з тэкстам падразумявае засваенне спосабаў дзейнасці, скіраваных на адэкватнае ўспрыманне, вытлумачэнне, інтэрпрэтацыю вучэбнай інфармацыі. Гэта падразумявае як сістэму лінгвістычных ведаў, так і сістэму ўменняў, скіраваных на аналіз гатовых (чужых) і стварэнне ўласных тэкстаў, уменняў адэкватна разумець інфармацыю. Базавыя, апорныя ўменні могуць быць сфарміраваны толькі на ўзроўні вучэбнага тэксту.

Тэкст патэнцыяльна праецыруе алгарытм пазнавальнай дзейнасці па засваенні вучэбнай інфармацыі. Вучэбны тэкст першасна запраграмаваны на прачытанне і засваенне, што адбываецца ў працэсе выканання заданняў на аснове тэксту. Адпаведна аптымальны вучэбны тэкст не толькі ўтрымлівае інфармацыю, але і праецыруе спосабы дзейнасці, з дапамогай якіх гэтая інфармацыя можа быць атрымана і скарыстана.

**Заключэнне.** Такім чынам, вучэбны тэкст як аснова фарміравання прадметных кампетэнцый навучэнцаў кардынальна змяняе ўяўленні пра пісьменнага чалавека – ад умення пісаць граматычна правільна да здольнасцей асобы адэкватна ўспрымаць, трансфармаваць інфармацыю. Тэкставая дзейнасць асобы выяўляе "сумарны" маўленчы вопыт працы з тэкстам праз комплекс універсальных уменняў.

Аб'ектам увагі на ўроках мовы павінны быць не толькі арфаграфічная і пунктуацыйная пісьменнасць, а ўменні аналізаваць і ствараць тэксты, усведамляць дыялог, суразмоўніцтва як формы сацыяльнага быцця чалавека. Праз працу з тэкставай інфармацыяй развіваюцца мысленне, інтэлектуальныя здольнасці асобы. Вучэбныя тэксты ў такім разуменні выступаюць сродкам развіцця інфармацыйнай культуры, запатрабаванай сучасным грамадствам.

ЛІТАРАТУРА

1. Дридзе, Т.М. Текстовая деятельность в структуре социальной коммуникации / Т.М. Дридзе. – М. : Наука, 1984. – 268 с.
2. Болотнова, Н.С. Коммуникативная стилистика текста: словарь-тезаурус / Н.С. Болотнова. – М. : Флинта, 2009. – 384 с.
3. Кубрякова, Е.С. О тексте и критериях его определения / Е.С. Кубрякова // Текст. Структура и семантика : в 2 т. – Т. 1. – М., 2001. – С. 72–81.
4. Матвеева, Т.В. Функциональные стили в аспекте текстовых категорий: синхронно-сопоставительный очерк / Т.В. Матвеева. – Свердловск : Изд-во Уральск. ун-та, 1990. – 170 с.
5. Гальперин, И.Р. Текст как объект лингвистического исследования / И.Р. Гальперин ; отв. ред. Г. В. Степанов. – Изд. 9-е. – М. : ЛЕНАНД, 2016. – 144 с.
6. Никитина, Е.С. Смысловой анализ текста: психосемиотический подход / Е.С. Никитина. – М. : ЛЕНАНД, 2019. – 200 с.
7. Чернявская, В.Е. Текст в медиальном пространстве : учеб. пособие / В.Е. Чернявская. – М. : ЛЕНАНД, 2017. – 232 с.
8. Тураева, З.Я. Лингвистика текста : учеб. пособие / З.Я. Тураева. – 2-е изд., доп. – М. : ЛИБРИКОМ, 2009. – 144 с.
9. Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества / М.М. Бахтин. – М. : Искусство, 1979. – 444 с.
10. Золотова, Г.А. Коммуникативные аспекты русского синтаксиса / Г.А. Золотова. – М. : Наука, 1982. – 368 с.
11. Чистякова, Г.Д. Исследование понимания текста как функции его смысловой структуры : автореф. дис. … канд. психол. наук : 19.00.01 / Г.Д. Чистякова ; НИИ общей и пед. психол. – М., 1995. – 24 с.

12. Павлова, А.И. Формирование коммуникативной компетентности учащихся 5–9 классов в работе с учебно-научными текстами : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.02 / А.И. Павлова ; Орл. гос. ун-т. – Орел, 2007. – 23 с.
13. Золотухина, Т.О. Психолого-педагогические условия понимания учебных текстов студентами-психологами : автореф. дис. … канд. психол. наук : 19.00.07 / Т.О. Золотухина ; Воронеж. гос. ун-т. – Курск, 2009. – 24 с.
14. Клякина, Е.А, Обучение студентов-филологов приемам интерпретации научного текста в целях учебного общения : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.02 / Е.А. Клякина ; Морд. гос. пед. ин-т. – Ярославль, 2006. – 27 с.
15. Семерджиди, В.Н. Лингвистические и дидактические особенности учебного текста на иностранном языке (русском и английском) / В.Г. Семерджиди // Вестн. ВГУ. Сер. Лингвистика и межкультурная коммуникация. – 2017. – № 2. – С. 117–122.
16. Ляшчынская, В.А. Методыка выкладання беларускай мовы. Маўленне : вучэб. дапам. для студэнтаў / В.А. Ляшчынская. – Мінск : РІВШ, 2009. – 168 с.
17. Протчанка, В.У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В.У. Протчанка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2001. – 212 с.
18. Жинкин, Н.И. Язык – речь – творчество / Н.И. Жинкин // Избр. тр. – М. : Наука, 1998. – 224 с.
19. Холодная, М.А. Психология интеллекта. Парадоксы исследования / М.А. Халодная. – СПб. : Питер, 2002. – 272 с.
20. Леонтьев, А.Н. Лекции по общей психологии : учеб. пособие / А.Н. Леонтьев. – М. : Смысл, 2000. – 511 с.

*Паступіў 22.09.2021*

## THE TEXT OF A SCHOOL TEXTBOOK ON THE BELARUSIAN LANGUAGE AS A LINGUO-METHODOLOGICAL BASIS FOR THE FORMATION OF SUBJECT COMPETENCES

***L. VASYUKOVICH***

*The article defines the specificity of the educational text, determined by the nature of cognitive activity, in which the unit acts as an object, instrument, basis, product of education. The typological text categories are analyzed: informativeness, communicativeness, dialogicality, addressing, axiological, universality. The author comes to a reasonable conclusion that the educational text as the basis for the formation of subject competencies has a multi-aspect linguo-methodological status: a linguistic-semantic standard of textual activity, a substantive support for statements, a means of preserving cultural information, a method of acquiring intellectual-speech experience.*

***Keywords:*** *text of a school textbook, subject competences, text categories, linguo-methodological status of the educational text.*

## УЧЕБНЫЙ ТЕКСТ ШКОЛЬНОГО УЧЕБНИКА НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ КАК ЛИНГВОМЕТОДИЧЕСКАЯ ОСНОВА ФОРМИРОВАНИЯ ПРЕДМЕТНЫХ КОМПЕТЕНЦИЙ

***Л. ВАСЮКОВИЧ***

*Определена специфика учебного текста, обусловленная характером познавательной деятельности, в которой единица выступает как объект, инструмент, основа, продукт обучения. Анализируются типологические категории текста: информативность, коммуникативность, диалогичность, адресность, аксиология, универсальность. Автор приходит к выводу, что текст как основа формирования предметных компетенций характеризуется многоаспектностью лингвометодического статуса: лингвосмысловой эталон текстовой деятельности, содержательная опора выражений, средство сохранения культурной информации, способ накопления интеллектуального и разговорного опыта.*

***Ключевые слова:*** *учебный текст школьного учебника, предметные компетенции, категории учебника, лингвистический и методический статус учебника.*